ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!



# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 11 (647) | Аўторак, 31 сакавіка 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**ЦК КПСС зацвердзіў «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне». Гэты гістарычнай важнасці дакумент цяпер усебакова вывучаецца кожным, хто заклапочаны аб хутчэйшым удасканальванні і павышэнні якасці падрыхтоўкі маладых кадраў для ўсіх галін народнай гаспадаркі.**

## ЯКІМ БЫЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТУ

Спалучыць дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з планавай эканомікай, прывесці ў дзеянне ўвесь патэнцыял сацыялізму — такая сёння стратэгія нашага развіцця. Перабудова ідзе па ўсяму фронту, пранікаючы ўшырыню і ўглыбіню. І велізарная роля ў яе ажыццяўленні належыць вышэйшай школе. Рашэнне праграмнай задачы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця патрабуе карэннага паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў. Пасля шырокага абмеркавання ў друку, у ВНУ і тэхнікумах, навуковых установах, на прадпрыемствах, улічыўшы шматлікія заўвагі і прапановы, выказаныя ў ходзе гэтага абмеркавання, ЦК КПСС зацвердзіў «Асноўныя напрамкі парабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі краіны».

Вялікія заслугі вышэйшай школы ў выхаванні і навучанні спецыялістаў. Але разам з тым у апошні час у яе рабоце праявіліся негатыўныя з'явы, пераважаў экстэнсіўны шлях развіцця: рост выпуску спецыялістаў, часам не абгрунтаваны, не суправаджаўся павышэннем якасці іх падрыхтоўкі. Узровень навучання і выхавання студэнтаў сёння не адпавядае задачам паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Зацягнулася станаўленне вялікай колькасці новых ВНУ. У вучэбным працэсе робіцца ўпор на пашырэнне аб'ёму вывучаемага матэрыялу, недастаткова ўвагі ўдзяляецца індывідуальнай рабоце з будучымі спецыялістамі. Многія ВНУ адарваны ад вытворчасці, слаба звязаны з навуковымі ўстановамі.

Такім чынам, узнікла неабходнасць у глыбокай перабудове вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у выніку якой будзе забяспечана новая якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у цеснай сувязі з карэнным паляпшэннем іх выкарыстання, гарантуючая выхад нашай краіны на перадавыя рубяжы навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу. Ставіцца задача дабіцца апераджальнага развіцця вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў адносінах да тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Важнейшы напрамак перабудовы — інтэграцыя адукацыі з вытворчасцю і навукай, пераход да новых прынцыпаў іх узаемадзеяння.

Варта пашырыць практыку перанясення часткі вучэбнага працэсу на вытворчасць, ствараючы вучэбна-навукова-вытворчыя комплексы, куды б уваходзілі філіялы кафедр, лабараторыі, эксперыментальныя ўчасткі. Такі вопыт ужо накоплены ў радзе ВНУ Ленінграда, Масквы, Новасібірска, і ён сябе апраўдаў, паколькі гэта — надзейная перадумова спалучэння фундаментальнай адукацыі з падрыхтоўкай студэнтаў да работы ва ўмовах канкрэтнай практычнай дзейнасці. Гэта дазволіць дакладней вызначаць рэальную патрэбу ў кадрах.

Разам з тым прадстаіць распрацаваць прававыя і адміністрацыйныя меры павышэння адказнасці міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў за абгрунтаванасць заявак на падрыхтоўку тых або іншых спецыялістаў, за прыём на работу выпускнікоў ВНУ і тэхнікумаў, за стварэнне ім адпаведных умоў працы і быту. Улічваю-

(Заканчэнне на 2-ой стар.).

## Пленум ЦК КПБ

25 сакавіка ў Мінску адбыўся VI пленум ЦК Кампартыі Беларусі.

Пленум разгледзеў пытанне «Аб задачах партыйных арганізацый рэспублікі па паглыбленню перабудовы, паляпшэнню работы з кадрамі ў святле патрабаванняў студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС».

З дакладам выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Я. Я. Сакалоў.

Пленум заслухаў інфармацыю міністра ўнутраных спраў БССР В. А. Піскарова «Аб рабоце Міністэрства ўнутраных спраў БССР па выкананню пастановы партыі і ўрада аб пераадоленні п'янства і алкагалізму». Па гэтаму пытанню выступіў загадчык аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПБ П. С. Адамовіч.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты пастановы.

Разгледжана арганізацыйнае пытанне.

Пленум выбраў членам бюро ЦК КПБ намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР, старшыню Дзяржплана рэспублікі В. Ф. Кебіча, зацвердзіў М. Р. Вайцянкова загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці ЦК КПБ, вызваліўшы ад гэтай пасады А. І. Цішкевіча ў сувязі з пераходам на іншую работу.

У рабоце пленума прыняў удзел інструктар Аддзела арганізацыйна-партыйнай работы ЦК КПСС Г. П. Мешчаракоў.

*У парткоме*

## НЕАБХОДНЫ НОВЫЯ ВЫШЫНІ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта, якое адбылося ў мінулую сераду, асноўным на парадку дня было пытанне «Аб павышэнні ўзроўню навукова-даследчай работы на фізічным факультэце ў святле патрабаванняў XXVII з'езда КПСС».

Са справаздачай выступіў дэкан фізічнага факультэта дацэнт М. В. Максіменка. Ён дэталёва прааналізаваў стан і эфектыўнасць навукі на факультэце, адзначыў некаторыя поспехі ў яе развіцці, сказаў і аб наяўных недахопах.

Ад камісіі, рыхтаваўшай пытанне для разгляду на пасяджэнні партыйнага камітэта, выступіў член парткома дацэнт У. І. Міроненка.

Шмат лічбаў аб удзеле студэнтаў фізічнага факультэта ў выкананні навуковых даследаванняў прывёў загадчык студэнцкага канструктарскага бюро А. У. Гаеў. Ён зазначыў, што галоўнае — не колькасны паказчык ахопу будучых спецыялістаў НДР, а яе эфектыўнасць. Як раз у гэтых адносінах фізічны факультэт за апошнія гады прыкметна здаў свае пазіцыі.

На пасяджэнні парткома выступілі загадчыкі кафедр факультэта дацэнты А. М. Сердзюкоў, І. Ф. Дабравольскі, рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць. Зроблены агульны вывад: нягледзячы на асобныя недахопы і ўпушчэнні, якія мелі месца на фізічным факультэце ў арганізацыі і праўядзенні навуковых даследаванняў, яго калектыў стаіць на правільным шляху. На сённяшні дзень ён мае найбольш высокі навуковы патэнцыял і вялікія рэзервы для яго росту. Пераважная большасць навуковых распрацовак, якія ажыццяўляюцца на фізфаку, маюць фундаментальны характар і ўваходзяць у тэматыку важнейшых, прадугледжаных нядаўна на агульным гадавым сходзе Акадэміі навук СССР. Цяпер задача заключаецца ў тым, каб выконваемыя НДР максімальна наблізіць да патрэб розных галін народнай гаспадаркі горада і вобласці, паскорыць іх укараненне ў вытворчасць, павысіць эфектыўнасць. Значна актывізацыі і большай аддачы ў адпаведнасці з патрабаваннямі «Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне» трэба дамагацца ад студэнцкай навукі.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова, якая абавязвае калектыў фізічнага факультэта і ў будучым знаходзіцца ў авангардзе універсітэцкай навукі.

На пасяджэнні парткома разгледжаны таксама кадравыя і некаторыя іншыя пытанні.

## САМАКІРАВАННЮ — ПАРТЫЙНЫ КЛОПАТ

26 сакавіка праведзены чарговыя заняткі партыйнага актыву універсітэта. На іх былі запрошаны таксама камсамольскія актывісты.

Абмеркавана пытанне аб ролі партактыву ў развіцці студэнцкага самакіравання. Заслухана і абмеркавана выступленне сакратара парткома М. І. Старавойтава.

Перад партыйнымі арганізацыямі факультэтаў пастаўлена задача аказання ўсямернай дапамогі ў стварэнні і актывізацыі работы студэнцкіх органаў самакіравання.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую актыўную вучэбна-выхаваўчую, навукова-даследчую работу і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры эканомікі працы АКУЛІЧ Мікалай Уладзіміравіч узнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата, парткома і прафкома універсітэта.

*«Дні дружбы-87»*

## З НАДЗЕЯЙ НА НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ

Як толькі прыходзіць вясна, у госці да членаў Клуба інтэрнацыянальнай дружбы «Саюз» ГДУ прыязджаюць жаданыя госці. На працягу тыдня яны знаёмяцца з нашым універсітэтам, яго слаўнымі традыцыямі, выдатнымі мясцінамі г. Гомеля, знаходзяць на гасціннай палескай зямлі шмат новых сяброў.

Сёлета на традыцыйныя Дні дружбы ў наш універсітэт прыехалі дэлегацыі з Кіева, Цярнопаля і Чарнаўцоў. Жаданых гасцей сардэчна прынялі кідаўцы універсітэта. У першы дзень праграмы «Дзён дружбы-87» у пакоі КІДа «Саюз» адбыўся вечар знаёмстваў. Было аб чым расказаць, што пераняць каштоўнага ў інтэрнацыянальнай рабоце чатырох ВНУ на канферэнцыі па абмену вопытам, якая прайшла на наступны дзень.

З'яднанне студэнтаў з усіх куткоў нашай Радзімы, розных нацыянальнасцей дзеля агульнай мэты — братэрства, сяброўства моладзі, яе актыўнай барацьбы за захаванне міру на Зямлі — што можа быць задачай, больш высакароднай! Аб гэтым яшчэ раз мовай музыкі, вершаў, алоўка і пэндзля гаварылася на вечарах палітычнага плаката і песні, які быў састаўной часткай насычанай і цікавай праграмы «Дзён дружбы-87».

Каго могуць не ўразіць, пакінуць абыякавымі выдатныя месцы нашага горада? Экскурсія па іх прынесла украінскім гасцям сапраўднае задавальненне. З народным беларускім мастацтвам, умельствам нашых землякоў, вытокі якога пачыналіся яшчэ ў мінулых стагоддзях, украінскія сябры пазнаёміліся ў час наведання Гомельскага ПТВ № 126 народных мастацкіх промыслаў і Веткаўскага музея народнай творчасці.

Багатыя на самадзейныя таленты студэнты Гомельскага дзяржуніверсітэта. У гэтым пераканаліся госці на канцэрце ўдзельнікаў клуба мастацкай самадзейнасці «Маладосць», які адбыўся ў актавай зале універсітэта.

У адзін з дзён украінскія сябры пабывалі ў гасцях у студэнтаў Гомельскага кааператыўнага інстытута, дзе паглядзелі спектакль, пастаўлены артыстамі самадзейнага тэатра ГКІ, пабылі на дыскатэцы.

Урачыстае закрыццё «Дзён дружбы-87» адбылося ў суботу, 28 сакавіка ва універсітэцкім студэнцкім кафэ. Сябры цёпла развітваліся і выказвалі надзею на новыя сустрэчы.

Т. НІКАЛАЕВА.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра філасофіі горача віншуюць асістэнта ЛОЙКУ Аляксандра Іванавіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

24-га красавіка адбудзецца адкрыты агульнауніверсітэцкі партыйны сход з парадкам дня: «Задачы партыйнай арганізацыі і калектыву універсітэта ў святле рашэнняў студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС і «Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі краіны».

Пры падрыхтоўцы да сходу прапануецца прыняць актыўны ўдзел у шырокім абмеркаванні дадзенага пытання, выказаць свае меркаванні і прапановы на старонках шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт».

ПАРТКОМ.

# ЯКІМ БЫЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

чы, што якасць навучання вызначаецца ў практычнай дзейнасці, вырашана па заканчэнні ВНУ уручаць выпускнікам дыплом аб вышэйшай адукацыі, а па выніках трох гадоў працы па месцу размеркавання — кваліфікацыйны атэстат спецыяліста, у якім павінен знайсці адлюстраванне іх творчы рост.

У перыяд паскарэння і перабудовы галоўная задача вышэйшай школы — павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Вырашаць яе варта, абапіраючыся на самастойную работу студэнтаў, актыўныя формы і метады навучання. Адным з асноўных спосабаў развіцця аналітычнага і творчага мыслення павінен стаць удзел студэнтаў у навуковых даследаваннях, рэальных праектных і канструктарска-тэхналагічных распрацоўках. Надзейным сродкам ўсебаковай інтэнсіфікацыі і павышэння якасці вучэбнага працэсу стане яго камп'ютэрызацыя.

Для ўдасканальвання індывідуальнай работы спатрэбіцца зменшыць колькасць студэнтаў на аднаго выкладчыка, у тым ліку і за кошт скарачэння кантынгенту навучаючыхся на некаторых спецыяльнасцях. Пры правядзенні практычных, семінарскіх, лабараторных заняткаў прадугледжваецца дзяленне вучэбнай групы на дзве падгрупы. Прадстаіць развіваць навучанне па індывідуальных планах, павялічыць колькасць факультатыўных курсаў і дысцыплін па выбару. Студэнцкія калектывы трэба натхняць на барацьбу за веды, садзейнічаць больш поўнаму раскрыццю здольнасцей і дараванняў моладзі. Пры гэтым варта ўдасканальваць адбор будучых спецыялістаў на працягу ўсяго тэрміну іх навучання, развіваючы саперніцтва ў авалоданні ведамі.

Вышэйшая школа пераходзіць да фарміравання спецыялістаў шырокага профілю, спалучаючы глыбокія фундаментальныя веды і грунтоўную практычную падрыхтоўку. Неабходна павысіць ролю вытворчай практыкі ў навучанні студэнтаў, каб яшчэ на вузаўскай лаўцы яны авалодвалі навыкамі прафесіянальнага майстэрства, асновамі арганізатарскай і выхаваўчай работы ў працоўных калектывах. Да практычнага навучання студэнтаў варта прыцягваць вядучых работнікаў вытворчасці.

Вялікае значэнне ў павышэнні якасці будучых спецыялістаў мае адбор у ВНУ найбольш падрыхтаваных маладых людзей, якія праявілі схільнасці да выбранай спецыяльнасці.

Уздым вышэйшай школы патрабуе сур'ёзнага паляпшэння дзейнасці універсітэтаў. Нездарма ж гавораць — універсітэцкі горад, універсітэцкае прыцягненне. Універсітэты закліканы стаць праваднікамі перадавой навуковай думкі ва ўсіх звеннях прагрэсу і асветы. Іменна універсітэтам прадстаіць развіваць падрыхтоўку спецыялістаў па новых напрамках на стыках навук.

Навукова-тэхнічны прагрэс дыктуе і неабходнасць рашучай перабудовы інжынернай адукацыі. Працэс фарміравання інжынераў нашага заўтра павінен садзейнічаць развіццю навыкаў самастойнай творчасці, сістэмнага аналізу тэхніка-эканамічных праблем, умення знаходзіць самыя эфектыўныя рашэнні. Іменна схільнасці і здольнасці ў тэхнічнай творчасці варта зрабіць адным з важнейшых крытэрыяў адбору моладзі на інжынерныя спецыяльнасці.

Асаблівую ўвагу прадстаіць удзяліць падрыхтоўцы кадраў у новых галінах навукі і тэхнікі, такіх, як генная інжынерыя, біятэхналогія і іншых, а таксама ў кіруючай дзейнасці. Будуць узмоцнены эканамічнае выхаванне спецыялістаў, іх арыентацыя на рацыянальнае і комплекснае прыродакарыстанне.

Спецыяліст нашага сёння і заўтра павінен валодаць грунтоўнай марксісцка-ленінскай падрыхтоўкай, сучасным эканамічным мысленнем, навыкамі кіраўнічай, арганізатарскай і выхаваўчай работы, актыўнымі метадамі выкарыстання вылічальнай тэхнікі прымяняльна да профілю сваёй дзейнасці, высокай агульнай культурай, веданнем замежнай мовы. Яму ўласцівы ініцыятыва і адказнасць, патрэба ў пастаянным аднаўленні і абагачэнні сваіх ведаў, здольнасць смела прымаць наватарскія рашэнні і актыўна прыводзіць іх у дзеянне.

«Асноўныя напрамкі парабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне» — дзейсная праграма пераўтварэнняў, якую прадстаіць ажыццявіць у бліжэйшыя гады. У яе ажыццяўленні важнейшая роля належыць партыйным органам, прафсаюзам і камсамолу і, канешне, мясцовым Саветам. Каму, як не ім, паклапаціцца аб тым, каб вузаўскія гарады сталі сапраўднымі цэнтрамі навукі, культуры і асветы.

(Газета «Известия», № 83 за 1987 г.)



НА ЗДЫМКУ: члены аператыўнага камсамольскага атрада дружыннікаў ГДУ (злева направа): А. Дрозд, А. Дворак, В. Пракапенка, Л. Шэлег, М. Жукевіч.

Фота А. Ульянкінай.

*На ахове правапарадку*

# ПА КАМСАМОЛЬСКАМУ АБАВЯЗКУ

Аператыўныя камсамольскія атрады дружыннікаў з'яўляюцца адной з эфектыўных і масавых форм удзелу камсамольскіх арганізацый ва ўмацаванні сацыялістычнага правапарадку, папярэджанні антыграмадскіх праяўленняў у маладзёжным асяроддзі, прававым выхаванні юнакоў і дзяўчат.

Адзін з такіх атрадаў створан у нашым універсітэце. На працягу звыш пяці гадоў яго існавання ў ім склаліся свае традыцыі, якія пастаянна ўзбагачаюцца. Цяпер атрад налічвае 118 членаў і больш 150 кандыдатаў у члены АКАД. Кіраўніцтва ажыццяўляе штаб АКАД, які зацверджаны на пасяджэнні камітэта камсамола універсітэта. А кожны член штаба кіруе асобнай групай, сфарміраванай на факультэтах, забяспечвае планаванне работы і вядзе ўлік яе вынікаў.

Аператыўны камсамольскі атрад дружыннікаў ГДУ арганізоўвае патруляванне па пэўных маршрутах горада, выстаўляе пасты каля маладзёжных інтэрнатаў, у месцах масавага адпачынку юнакоў і дзяўчат, аказвае дапамогу інспекцыі па справах непаўналетніх, падтрымлівае парадак на унутрыуніверсітэцкіх мерапрыемствах.

За добрую работу члены АКАД ГДУ неаднаразова ўзнагароджваліся граматамі райкома, гаркома, абкома ЛКСМБ. У гэтым годзе 7 членаў аператыўнага атрада ўзнагароджаны знакамі ЦК ВЛКСМ «За ахову грамадскага парадку». Нядаўна гэтыя ўзнагароды ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўручаны ў камітэце камсамола універсітэта Міхаілу Жукевічу, Антону Двораку, Людміле Шэлег, Таццяне Яўсеенка, Леаніду Кушнярову, Віктару Пракапенку, аўтару гэтых радкоў. Сёлета ж 10 студэнтаў былі заахвочаны пуцёўкамі ў міжнародныя маладзёжныя цэнтры краіны.

Добра наладжана работа аператыўных камсамольскіх атрадаў на фізічным факультэце (камандзір — Мікалай Руеў), геафаку (Антон Дворак), матэматычным факультэце (Сяргей Савенка). Сваімі добрасумленнымі адносінамі да грамадскага абавязку гэтыя юнакі паказваюць на справе, як зладжана працуе калектыў зацікаўленых людзей. Члены атрада дружыннікаў фізічнага факультэта нават ў час не свайго дзяжурства выканалі грамадскі абавязак: ва універсітэцкім парку абаранілі ад хуліганаў жанчыну, выклікалі нарад міліцыі.

Заўсёды дзейсна працуе і атрад дружыннікаў геалагічнага факультэта. Яго камандзір здолеў так арганізаваць работу, што неаднойчы атрад займаў першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод АКАД іншых факультэтаў.

Зусім нядаўна стаў камандзірам аператрада матэматычнага факультэта Сяргей Савенка, а выніікі яго работы ўжо прыкметныя.

Усё гэта станоўчыя бакі аператыўнай праваахоўнай дзейнасці камсамольцаў універсітэта. Але ёсць і негатыўныя. Фактычна гэта работа развалена на эканамічным і гісторыка-філалагічным факультэтах. Не прыцягваюцца да яе кандыдаты ў члены АКАД, значыць, няма і рэзерву. Калі да канца навучальнага года становішча тут не будзе выпраўлена, то работу камандзіраў заслухае камітэт камсамола ГДУ, дзе будзе дадзена прынцыповая ацэнка выкананню імі грамадскага даручэння.

Наша мэта — працягваць і памнажаць лепшыя традыцыі праваахоўнай работы ва універсітэце, замацаваць званне аднаго з лепшых аператыўных атрадаў Цэнтральнага раёна і ўсяго г. Гомеля.

А тых, хто жадае стаць дружыннікам, мы запрашаем да нас. Запісацца ў АКАД можна праз камсамольскія бюро факультэтаў.

**А. ДРОЗД,**
**камандзір АКАД ГДУ,**
**студэнт 4-га курса гістфіла.**

70

*Памятныя мясціны Гомеля*

# Вуліца імя С. С. Камісарава

С. С. Камісараў, імя якога носіць адна з вуліц г. Гомеля, пачаў сваю рэвалюцыйную дзейнасць у 1913 годзе. 18-гадовым юнаком ён уступіў у адзін з падпольных бальшавіцкіх гурткоў Палескага камітэта РСДРП.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі С. Камісараў быў ў ліку актыўных савецкіх работнікаў. У гады станаўлення Савецкай улады на Гомельшчыне ён з'яўляўся членам прэзідыума Гомельскага гарвыканкома.

Пасля акупацыі Гомеля нямецкімі войскамі С. Камісараў працягвае актыўную партыйную і савецкую работу ў Маскве. Ён выбіраўся сакратаром Баўманскага райкома РКП(б), уваходзіў у састаў прэзідыума раённага Савета. З першай раённай мабілізацыяй С. Камісараў ад'язджае на фронт. Спачатку ён — камісар палка, затым брыгады, прайшоў вялікі баявы шлях ад Казані да Уфы.

Калі Гомель быў вызвалены ад нямецкай акупацыі, С. Камісараў зноў вяртаецца сюды і працуе на савецкай рабоце. У абласным архіве захоўваюцца пратаколы пасяджэнняў Гомельскага рэвалюцыйнага камітэта і выканкома Савета за люты-сакавік 1919 г., якія адбыліся пад старшынствам С. Камісарава. На пасяджэнні рэўкома 9 лютага гэтага ж года ён быў зацверджан яго старшынёй. На гэтым пасяджэнні, якое праходзіла пад старшынствам С. Камісарава, быў вырашаны цэлы рад важных пытанняў. Рэўком прыняў рашэнне аб надзвычайным налогу, назначыў М. І. Хатаевіча старшынёй надзвычайнай камісіі, па пытанню «Аб рабоце аддзелаў» была прынята пастанова: «Лічыць неабходным уваходжанне старшыні рэўкома ў справы ўсіх аддзелаў. Лічыць неабходнымі сумесныя пасяджэнні рэўкома і загадчыкаў аддзеламі на пасяджэннях прэзідыума, якія праходзяць штодзённа».

Цэлы рад неадкладных і важных пытанняў рэўком на чале з Камісаравым рашаў і на іншых пасяджэннях. Так, на адным з іх рэўком зацвердзіў эканамічны аддзел у саставе прадстаўнікоў упрадкома, аддзела земляробства і фінансавага аддзела. Разгледзеўшы пытанне аб бягучых рахунках памешчыкаў, 20 лютага 1919 г. рэўком пастанавіў: «Лічыць бягучы рахунак Паскевіча перайшоўшым на бягучы рахунак аддзела земляробства».

Калі 24 сакавіка 1919 г. у Гомелі ўспыхнуў контррэвалюцыйны стракапытаўскі мяцеж, С. Камісараў стаў адным з актыўных арганізатараў узброенага адпору мяцежнікам. Ён з'яўляўся членам ваеннага штаба па абароне горада. У час асады гасцініцы «Савой» С. Камісараў да канца захоўваў бадзёрасць духу. 29 сакавіка 1919 г. ён разам з групай абараняўшых «Савой» быў па-зверску забіты стракапытаўцамі.

Памяць пра С. С. Камісарава ўвекавечана ў назве вуліцы г. Гомеля. Мужны камуніст, які аддаў жыццё за справу рэвалюцыі, жыве ў сэрцах савецкіх людзей.

**В. ЛУГАЎСКАЯ,**
**заг. аддзела Гомельскага абллдзяржархіва.**

# ЗА МАЙСТЭРСТВА І ФАНТАЗІЮ

### УЗНАГАРОДЖАНЫ ПЕРАМОЖЦЫ І ЎДЗЕЛЬНІЦЫ ВЫСТАЎКІ

Жансавет універсітэта падвёў вынікі выстаўкі дэкаратыўна - прыкладных і мастацкіх работ выкладчыц і супрацоўніц універсітэта «Усё ўмеюць нашы мамы», якая прысвячалася святу 8 Сакавіка.

За цікавыя экспанаты, арыгінальнасць і майстэрства іх выканання граматамі прафкома і жансавета ГДУ ўзнагароджаны:

**Т. А. Скрынічэнка**, загадчыца аспірантуры; **Л. Л. Дзямянцей**, асістэнт кафедры рускай літаратуры; **Э. І. Лізарава**, ст. н. с. кафедры эканомікі працы; **М. В. Ігнатава**, загадчыца лабараторыямі эканамічнага факультэта; **Л. Д. Акуліч**, ст. выкладчыца кафедры англійскай мовы; **І. В. Куркаева**, лабарантка галіновай навукова-даследчай лабараторыі геалагічнага факультэта; **Н. В. Торап**, асістэнт кафедры дыфураўненняў; **І. І. Кобыш**, асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства; **Т. П. Кадол**, ст. інжынер-матэматык; **С. А. Лін**, асістэнт кафедры беларускай мовы; **Д. А. Басава**, асістэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды; **І. С. Шчадравіцкая**, аператар ІВЦ; **А. Я. Малахава**, дацэнт кафедры хіміі.

Усім астатнім удзельніцам выстаўкі аб'яўлена падзяка, дзеці атрымаюць памятныя падарункі.

Наступная выстаўка, якую арганізоўвае жансавет, пазнаёміць наведвальнікаў з кулінарным майстэрствам выкладчыц і супрацоўніц універсітэта. На ёй можна будзе прадэгуставаць кулінарныя вырабы, купіць рэцэпты іх прыгатавання. Яна адбудзецца 24-га красавіка ў фае галоўнага корпуса ГДУ. Жансавет запрашае прыняць у ёй актыўны ўдзел ўсіх, хто хоча паказаць свае здольнасці ў кулінарыі.

**Т. ДУБЯК,**
**член жансавета.**

*Студэнцкая творчасць*

# «...БЕЗ ГЭТАГА БУДЗЕ ЎЖО САПРАЎДЫ ЦЯЖКА»

Творчыя сустрэчы з салістамі студэнцкага клуба «Маладосць» становяцца добрай традыцыяй. На гэты раз гледачы знаёміліся ў актавай зале ГДУ з творчасцю квартэта ў саставе студэнтаў фізічнага факультэта Таццяны Парэмскай і Андрэя Шавардзіна, будучых эканамістаў Валерыя Ігнатава і Мікалая Васюка.

Першыя хваляванні, выступленні, канцэрты, першыя апладысменты былі ў кожнага з іх. І тое, што сёння на сцэне ўжо сталы калектыў — вынік вялікай творчай работы над сваім стылем, сцэнічным вобразам і рэпертуарам.

— Вельмі люблю спяваць, — расказвае аб сабе Таццяна Парэмская. — Гітара стала для мяне не проста звычайнай гітарай, а «інструментам для душы».

Спачатку Таццяна спявала толькі для сябе. І калі б не паступіла ва універсітэт, напэўна, усе песні так бы і памерлі ў ёй. Ішлі гады вучобы, і ўвесь свой вольны час дзяўчына праводзіла ў клубе мастацкай самадзейнасці, дзе працавала над сваім голасам. «Было цяжка, — гаворыць Таццяна, — але заўсёды побач знаходзіліся верныя сябры. Яны дапамагалі, падказвалі, вучылі мяне, за гэта ім вельмі ўдзячна».

Творчы шлях дуэта ў складзе Мікалая Васюка і Валерыя Ігнатава пачаўся з выступлення ў конкурснай праграме «Ану, першакурснікі» у 1984 годзе, калі журы адзначыла добрае выкананне песні «Жар-птушка» беларускіх аўтараў.



— Цяга да творчасці ў мяне з'явілася яшчэ ў час дзіцячых навагодніх ранішнікаў, — расказвае Валерый Ігнатаў. — Далей гэтыя схільнасці развіваліся ў агульнаадукацыйнай школе і паралельна — у музычнай. Відавочна, гэта і былі мае першыя крокі, а зараз пачаліся другія».

Творчую натуру Валерыя можна вызначыць так: сумненні, пошук, расчараванні, мары, знаходкі, работа, песня.

Адным з важных фактараў свайго жыцця — песню, лічыць для сябе і Мікалай Васюк. «Колькі жыву — столькі і спяваю», — гаворыць ён.

Каля года існавалі два дуэты. Разам спявалі Таццяна і Валерый, Валерый і Мікалай. Творчыя пошукі прывялі да рашэння стварыць трыо. Працаваць разам стала цікавей. На шматлікіх канцэртах зала апладыравала лаўрэатам фестывалю маладзёжнай песні і гарадскога фестывалю «Студэнцкая вясна—1985 і 1986» трыо студэнцкага клуба ГДУ Т. Парэмскай, В. Ігнатаву і М. Васюку.

У кожнага творчага калектыва наступае момант, калі востра паўстае пытанне аб далейшым шляху. З прыходам у калектыў Андрэя Шавардзіна павысіўся прафесіянальны ўзровень выканання песень. Больш багатым стала музычнае афармленне (Андрэй валодае ігрой на многіх музычных інструментах), песні загучалі ў шматгалоссі, удала вялася работа ў стварэнні сцэнічнага вобраза.

На працягу паўтары гадзіны зала ўважліва слухала песні ў выкананні квартэта, якія ўжо былі знаёмы ёй, і цёпла прымала новыя. Адбылася прэм'ера песні «Рускія бярозы» на вершы М. Рубцова.

«Настаў час, калі я зразумеў — без гэтага ўжо будзе сапраўды цяжка». Гэтыя словы прачыталі на канцэрце вядучыя з анкеты В. Ігнатава. «Мы можам зрабіць яшчэ больш», — сказаў М. Васюк. Аднадушная з імі і Таццяна Парэмская, якая ў гэтым годзе заканчвае вучобу ва універсітэце, але не закончацца яе творчыя пошукі. А вось словы Андрэя Шавардзіна: «...гэта была наша агульная перамога».

**М. ШЫРЫНКІНА.**

**НА ЗДЫМКУ** (злева направа): М. Васюк, А. Шавардзін, В. Ігнатаў, Т. Парэмская.

Фота П. Страіцелева.

# ПА АКТУАЛЬНАМУ ПЫТАННЮ

На біялагічным факультэце з праблемнай лекцыяй па радыялогіі выступіў загадчык аддзела Усесаюзнага ордэна Леніна інстытута біяфізікі Міністэрства аховы здароўя СССР доктар медыцынскіх навук, прафесар У. А. Кніжнікаў. У ёй асветлены асноўныя прынцыпы і паняцці радыялогіі, міграцыя нуклідаў у знешнім асяроддзі, прыродны і антрапагенны радыяцыйны фон. Асаблівая ўвага была ўдзелена праблемам радыяцыйнага фону ў Гомельскай вобласці ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС і ўплыву яго на здароўе насельніцтва. Прафесар У. А. Кніжнікаў адзначыў, што існуючыя метады кантролю прадуктаў харчавання выключаюць магчымасць пранікнення радыёнуклідаў у арганізм чалавека.

**В. ВЕРАМЕЕЎ,**
**асістэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды.**

# ДА ЎВАГІ ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў у красавіку 1987 г.

1. **Ленінскім курсам** (Да 117-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна).

2. **Быць вернымі рэвалюцыйным ідэалам з гонарам працягваць справу Кастрычніка.**

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці ацэнкі, вывады і ўстаноўкі, змешчаныя ў Звароце ЦК КПСС да савецкага народа і пастанове ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» (гл. газету «Правда» за 14 сакавіка 1987 г.).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

3. **Прымножым традыцыі Вялікага пачыну** (Аб шырокай падтрымцы працаўнікамі горада і вёскі патрыятычнай ініцыятывы перадавых калектываў правесці 18 красавіка г. г. Ленінскі камуністычны суботнік, азнаменаваць яго высокапрадукцыйнай, якаснай працай).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

4. **Раўненне — на перадавікоў** (Аб актыўным, творчым выкарыстанні вопыту пераможцаў Усесаюзнага і рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва 1986 года ў барацьбе за паспяховае выкананне планаў юбілейнага года і пяцігодкі ў цэлым).

Матэрыялы аб вопыце чырванасцяжных калектываў публікуюць «Звязда», «Советская Белоруссия», «Сельская газета».

5. **Падрыхтоўка спецыялістаў — на ўзровень сучасных патрабаванняў** (Аб асноўных напрамках перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне.).

Гл. газету «Правда» за 21 сакавіка 1987 г. Матэрыял публікуе «Настаўніцкая газета».

6. **Трывалая сям'я — моцная дзяржава** (Аб бацькоўскім аўтарытэце, значэнні маральнага прыкладу бацькоў для выхавання ў дзяцей працавітасці, сумленнасці, дабраты і іншых высокіх ідэйных і маральных якасцей).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Агитатор» № 5 за 1987 г.

7. **За Еўропу без ядзернай зброі** (Новыя прапановы СССР аб ліквідацыі ракет сярэдняй дальнасці на Еўрапейскім кантыненце — важны крок на шляху да бяз'ядзернага свету).

Матэрыял апублікаван у штотыднёвіку «За рубежом» № 10 за 1987 г. Рэкамендуецца выкарыстаць таксама артыкулы на гэту тэму ў цэнтральным і рэспубліканскім друку.

8. **Капіталізм без прыкрас: пакаленне, асуджанае на бяспраўе** (Аб беспрацоўі, галечы і абяздоленасці, прыгнечаным становішчы моладзі ў краінах капіталу).

Матэрыял публікуе газета «Чырвоная змена». Гл. таксама часопіс «Агитатор» № 5 за 1987 г.

# ВЫДАТНЫ ПРАДСТАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

**У гэтым годзе спаўняецца 410 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларуска-украінскага грамадскага, дзеяча, вучонага-філолага і педагога Мялеція Смятрыцкага.**

Мялецій Сматрыцкі (свецкае імя Максім Герасімавіч) нарадзіўся ў 1577 годзе (па іншых звестках — 1572 г.) на Падоллі ў м. Смотрыч у сям'і вядомага пісьменніка-палеміста Герасіма Сматрыцкага. Пачатковую адукацыю ён атрымаў пад непасрэдным кіраўніцтвам бацькі і грэка Кірылы Лукарыса, будучага канстанцінопальскага патрыярха. Юнак цягнуўся да ведаў, і ў хуткім часе ён быў прыняты ў Віленскую акадэмію на філасофскі факультэт, дзе праявіў цікавасць да тагачаснага палітычнага жыцця, якое ў апошняе дзесяцігоддзе XVI ст. на беларускіх і ўкраінскіх землях Рэчы Паспалітай рэзка абвастрылася. Гэта было выклікана ўзмацненнем класавай барацьбы і абуджэннем нацыянальнай самасвядомасці. Абарона праваслаўя (праваслаўнае веравызнанне было найбольш распаўсюджаным сярод беларусаў і ўкраінцаў) супраць усё ўзрастаючай каталіцкай экспансіі, за якой стаялі рэакцыйныя сілы Польшчы і Ватыкана, стала пытаннем жыцця і смерці цэлых народаў. У такіх умовах, калі рэлігія з'яўлялася адзінай пануючай ідэалогіяй, супраціўленне каталіцызму насіла ярка выяўлены дэмакратычны і патрыятычны характар. Палітычная атмасфера яшчэ больш накалілася, калі ў 1596 г. была падпісана Брэсцкая унія, якая юрыдычна замацавала панаванне папы рымскага над праваслаўнымі хрысціянамі. Перадавыя рэлігійна-грамадскія дзеячы Беларусі і Украіны, у тым ліку і М. Сматрыцкі, адмовіліся ад навязанай уніі і выступілі супраць яе.

Найбольш актыўную і паспяховую барацьбу супраць уніі Мялецій пачынае пасля таго, як ён, закончыўшы вучобу, правёў некалькі дзён у Германіі і Славакіі. Сматрыцкі набывае неўзабаве вялікі аўтарытэт сярод простага люду ў Мінску, дзе ўтвараецца праваслаўнае брацтва. Потым ён працягвае сваю патрыятычную і навуковую дзейнасць у віленскім праваслаўным брацтве, дзе пазнаёміўся з выдатным беларускім пісьменнікам-палемістам Лявонціем Карповічам. Агульныя палітычныя погляды садзейнічалі іх збліжэнню. Яны становяцца сябрамі і паплечнікамі.

У 1608 г. выходзіць у свет першы друкаваны твор М. Сматрыцкага «Антыграфі», накіраваны супраць уніі. Тут аўтар шырока выкарыстоўвае антыпапскую літаратуру Захаду, што сведчыла аб яго высокай адукаванасці.

Хутка М. Сматрыцкі становіцца на чале ўсяго антыўніяцкага і антыкаталіцкага руху на Беларусі і Украіне. Доказам гэтаму з'яўляецца і той факт, што Мялецій стаў аўтарам найбольш значнага антыўніяцкага трактата «Фрынас» («Плач Усходняй царквы»), які адыграў вялікую ролю ў аб'яднанні патрыятычных сіл.

У 1619 г. у Еўі выходзіць з друку славутая «Граматыка» Сматрыцкага, якая мела выключнае значэнне для свайго часу. На працягу цэлага стагоддзя яна не мела аналагаў ва ўсім славянскім свеце, нанесла ідэалагічны ўдар па Ватыкану, дзе бачылі у славянскай мове вытокі невуцтва рускага, украінскага і беларускага народаў.

Ішоў час. Жыццё беларускага працоўнага люду рабілася ўсё больш нясцерпным. Беларусь рабавалі як свае паны, так і літоўскія, польская карона і каталіцкая царква. У дваццатыя гады XVII ст. на Беларусі ўспыхваюць гарадскія паўстанні ў Магілёве, Віцебску, Полацку. Гнеў гараджан падае перш за ўсё на прадстаўнікоў уніяцкай царквы. Так у 1623 г. у Віцебску быў забіты ўніяцкі архіепіскап Кунцэвіч. У гэтым жа годзе М. Сматрыцкі (відаць, пад страхам нарастаючых народных хваляванняў) едзе на некалькі гадоў у падарожжа на Блізкі Усход. Пасля вяртання адтуль ён тайна пераходзіць ва ўніяцтва. Чаму так здарылася? Гэта складанае пытанне, адназначны адказ на якое сёння даць цяжка. Палітычная барацьба на той час дасягнула свайго апагею. Былі і пагрозы ў адрас М. Сматрыцкага з боку польскага караля Сігізмунда III. Але асноўнай прычынай адступлення Мялеція ад сваіх ранейшых перакананняў быў яго страх перад значна ўзросшым рухам народных нізоў. Ён пабаяўся парваць з класам магнатаў, на службе якіх знаходзіўся.

Цяпер, праз тры з паловай стагоддзі пасля смерці М. Сматрыцкага, мы ўспамінаем яго як выдатнага прадстаўніка беларускай культуры XVII стагоддзя, чалавека, які быў блізкі да простага народа, аўтара сусветна вядомай «Граматыкі», таленавітага пісьменніка-палеміста, заснавальніка новага ў беларускай літаратуры стылю — барока. Спадчына, пакінутая Мялеціем Сматрыцкім, па-ранейшаму прыцягвае да сябе даследчыкаў як у нашай краіне, так і за яе межамі.

**М. ШУКАНАЎ,**
**студэнт гр. БР-43 гісторыка-філалагічнага факультэта.**



У павышэнні якасці ведаў, удасканальванні падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй вялікая роля адводзіцца работнікам вузаўскіх бібліятэк. Як патрабуюць таго «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне», яны абавязаны папоўніць бібліятэчныя фонды навейшай вучэбнай і дапаможнай літаратурай, аказваць дзейсную дапамогу студэнтам у самападрыхтоўцы.

НА ЗДЫМКУ: бібліятэкар абанемента № 2 Т. Добшыкава.

*З надыходзячым днём смеху!*

Ул. БАГАМОЛЬНІКАЎ

## ПЕРШАКРАСАВІЦКІЯ ЎСМЕШКІ

**Н. А. СТАРОСТЕНКО, ассистенту кафедры русского, славянского и общего языкознания, зам. декана по научной работе.**

Соединять ученость с красотой
Всегда задачей было непростой.
Но все-таки, причем не очень охая,
Их сочетает дама ясноокая.

—◆—

**Л. Л. ДЕМЕНТЕЙ, ассистенту кафедры русской литературы**

Кто обижает Дементей,
Тот кровопийца и злодей,
А кто ласкает Дементей,
Тот самый лучший из людей.

—◆—

**І. Ф. ШТЭЙНЕРУ, даследчыку беларускіх балад, камандзіру ДНД на гістфіле.**

Іван узяўся за балады—
Цяпер і сын, і жонка рады.
А за дружыну ўзяўся — рад
Хіба што толькі дэканат.

—◆—

**Н. П. ШКАРБУНУ, пом. проректора па АХР**

Был человеком — им остался,
Не очерствел он, не зазнался.
В заботах весь и полон дел,
От них и впрямь он похудел.

—◆—

**СТИХИ О ПРЕКРАСНОЙ ДАМЕ (По мотивам Александра Блока)**

**Посвящаются женщинам, вступающим в Общество борьбы за трезвость.**

Я предложил тебе беспечно
Бокал искристого аи,
Но ты ответила сердечно:
«Не пью вина, люблю чаи».
Ты поступаешь очень здраво.
Не верь, что истина в вине.
Гоняй чаи! Мораль и право
Теперь на нашей стороне.

*Асновы здаровага ладу жыцця студэнтаў*

## Аб прывычках карысных і шкодных

### З вамі гутарыць урач

Прывычкі — гэта форма нашых паводзін. Карысныя прывычкі дапамагаюць фарміраванню гарманічна развітай асобы, шкодныя —наадварот, тармозяць яе станаўленне. Прывычкі надзвычай устойлівыя. Таму ў студэнцкім узросце важна выпрацоўваць у сябе карысныя прывычкі і рашуча змагацца са шкоднымі, якія могуць перайсці ў заганы. Карыснымі можна назваць імкненне да рэгулярнага павышэння ведаў, да заняткаў фізічнымі практыкаваннямі, чытанне кніг, наведванне тэатраў, кіно, захапленне музыкай.

Аднак у студэнцкія гады ўзнікае нямала і шкодных звычак. Гэта — нерацыянальны рэжым дня, нерэгулярная падрыхтоўка да заняткаў. Але найбольш шкоднымі, небяспечнымі для здароўя з'яўляюцца курэнне і злоўжыванне спіртнымі напіткамі. Яны непрыкметна могуць перарасці ў заганы, якія здольны сапсаваць жыццё маладому чалавеку.

Часцей за ўсё шкоднае ўздзеянне тытунёвага дыму звязваецца з нікацінам. Ён выклікае звужэнне сасудаў, павышэнне артэрыяльнага ціску, парушае работу сэрца. Нікацін уплывае і на сістэму дыхання. Нездарма ж студэнты, якія кураць, у час здачы нарматываў па фізічнаму выхаванню паказваюць вынікі больш нізкія, чым тыя, хто не курыць. Шкодна ўплывае нікацін на слізістую абалонку стрававальнага тракту. У тых, хто курыць, пагаршаецца кіслароднае забеспячэнне ўсіх клетак цела. У арганізм разам з тытунёвым дымам трапляюць эфірныя маслы, якія парушаюць рытм работы сэрца. Акрамя таго, у дыме ўтрымліваецца ад 2 да 7% вуглякіслага газу. Заўзятыя курыльшчыкі часцей хварэюць бранхітам, эмфізэмай лёгкіх. Вялікую шкоду наносіць курэнне печані, залозам унутранай сакрэцыі, палавым клеткам.

Ва ўсім свеце актыўна распрацоўваюцца метады барацьбы з курэннем. Аднак у першую чаргу сам чалавек павінен падключыць сваю волю, пераканацца сябе ў шкоднасці курэння і пазбавіцца гэтай шкоднай прывычкі.

Яшчэ большую шкоду чалавеку прыносіць ужыванне алкаголю. Трапляючы ў кроў, ён уздзейнічае на мозг і выклікае ў большасці людзей стан весялосці, павышанага імкнення да размовы, раскаванасці. Узнікае стан уяўнай свабоды, пераацэнкі асабістых магчымасцей. Далейшае павышэнне канцэнтрацыі алкаголю ў крыві (200—300 г выпітай гарэлкі) выклікае ап'яненне сярэдняй ступені. Падаўляецца нармальнае функцыяніраванне больш глыбокіх структур мозгу: наступае як весялосць без прычыны, так і неабгрунтаваная занепакоенасць, слязлівасць. Часта назіраецца пагаршэнне рухальных функцый. Калі чалавек выпівае 400—500 г. гарэлкі, наступае цяжкае ап'яненне. Пры гэтым парушаюцца ўспрыняцце, дзейнасць рухальных цэнтраў мозгу і органаў раўнавагі. З-пад кантролю выходзяць прымітыўныя інстынкты.

Пры яшчэ большай канцэнтрацыі алкаголю ў крыві (800—1000 г. выпітай гарэлкі) у чалавека можа наступіць шок. Рэфлексы бяздзейнічаюць. Чалавек можа нават памерці.

Нічога, акрамя бяды і шкоды, алкаголь чалавеку не прыносіць. Ён не толькі парушае нармальную работу ўсіх органаў, галаўнога мозгу і г. д., але і разбурае чалавека як асобу. Ад частых прыёмаў алкаголю развіваецца прывыканне да яго, якое вядзе да алкагалізму. Прычым, стаць хранічным алкаголікам можа нават чалавек, які п'е толькі піва.

Жыццёва важна для тых, хто злоўжывае спіртным, уключыцца у барацьбу з гэтай шкоднай прывычкай сваю асабістую волю.

**Г. ПЯТРОВА, урач-тэрапеўт паліклінікі № 6, член таварыства Чырвонага Крыжа.**

# СПОРТ

## З РОЎНЫМІ ШАНСАМІ НА МЕДАЛІ

У Брэсце адбыўся другі тур першынства Беларусі па ручному мячу сярод жаночых каманд. Па выніках першага тура турнірную табліцу ўзначальваў зборны калектыў Мінска. Сталічныя спартсменкі выйгралі тады ва ўсіх сваіх саперніц, у тым ліку з розніцай у пяць мячоў нанеслі паражэнне асноўным канкурэнтам за вышэйшыя ўзнагароды — гамяльчанкам. У другім туры наша каманда, за якую выступаюць у асноўным выхаванкі ГДУ, здолела ўзяць пераканаўчы рэванш — 31:24. Гамяльчанкі выйгралі і ва ўсіх астатніх саперніц: зборнай каманды школьніц рэспублікі — 24:16, калектываў Гродна — 37:15, Брэста — 31:25, Магілёва — 31:16.

Цяпер каманды Мінска і Гомеля маюць аднолькавую колькасць ачкоў і ўжо забяспечылі сабе месца ў фінальным квартэце мацнейшых. Яшчэ два прэтэндэнты на ўзнагароды першынства вызначацца ў трэцім туры спаборніцтваў, якія адбудуцца ў канцы красавіка ў Бабруйску.

Сярод гамяльчанак зладжанай гульнёй вызначаюцца варатар асістэнт кафедры фізічнага выхавання Ірына Самазванава, выпускніца эканамічнага факультэта, а цяпер інжынер вылічальнага цэнтра трэста «Гомельводбуд» Наталля Старавойт, першакурсніца факультэта фізвыхавання майстар спорту Валянціна Бурак, студэнтка 2-га курса матэматычнага факультэта Наталля Клімовіч. Яны і іх сяброўкі поўны рашучасці ў наступных турах першынства прыкласці ўсе намаганні і майстэрства, каб заваяваць званне чэмпіёнак рэспублікі.

**В. КРУКОЎСКІ, трэнер каманды.**

## УПЕРШЫНЮ ЧЭМПІЁНКІ БССР

У г. Гродна з 20 па 23 сакавіка праводзіўся чэмпіянат рэспублікі па скарасных відах падводнага плавання Гонар Гомельшчыны абаранялі і студэнты нашага універсітэта. Жаночая каманда была ўкамплектавана выхаванкамі факультэта фізвыхавання. У першы дзень спаборніцтваў яна стала сярэбраным прызёрам у эстафеце 4×200 м у ластах, а затым, прыклаўшы ўсё сваё майстэрства, выйграла заплыў 4×100 м. Медалі чэмпіёнаў атрымалі трэцякурсніцы Вольга Вярэмка, Алена Саўчыц, студэнтка першага курса Таццяна Банадысева, прэпаратар кафедры лёгкай атлетыкі Марына Ермалінская. Гэтыя ж спартсменкі сталі прызёрамі і на асобных дыстанцыях.

**Б. ГІЛЬ, ст. выкладчык кафедры фізвыхавання.**

## СПОРНА ЛАВІЛАСЯ РЫБА

Апошнім відам праграмы спартакіяды «Здароўе» сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта з'явіліся спаборніцтвы па зімовай рыбнай лоўлі. Іх удзельнікі выязджалі 22 сакавіка ў Рэпкаўскі раён суседняй Чарнігаўскай вобласці. Рыбаловы вялі спрэчку за званне лепшага пры выдатных умовах надвор'я. Клёў быў проста на зайздрасць. Найбольш пашанцавала У. Шырукову з геалагічнага факультэта. Злоўленая ім рыба заважыла 9 кг 200 г.

Не намнога адстаў ад пераможцы В. Харытошкін з кафедры фізвыхавання. Агульны яго ўлоў зацягнуў 8 кг 600 г. Да таго ж ён стаў уладальнікам самай буйной рыбіны. Адзін з акунёў, які трапіў на яго кручок, заважыў 550 г.

Трэцім прызёрам у індывідуальным заліку стаў выкладчык матэматычнага факультэта П. Верасовіч. Яго здабытак — 6 кг 900 г рыбы.

У агульным заліку першынство заваявала каманда факультэта фізвыхавання. За дзень яна злавіла 20 кг 200 г рыбы. Наступныя месцы дасталіся адпаведна рыбакам геалагічнага, матэматычнага, біялагічнага факультэтаў і АГЧ.

Пераможцы ў асабістым і камандным заліку, а таксама ўладальнік самага буйнага экземпляра рыбы ўдастоены грамат.

Лоўля рыбы — гэта не толькі захапляючы від спорту, але і выдатны адпачынак на ўлонні прыроды.

**(Наш кар.).**

## НА ЗАСНЕЖАНЫМ ПОЛІ

Зборная каманда універсітэта па футболу імкнулася падтрымліваць добрую спартыўную форму і зімой. Для гэтага яна рэгулярна трэніравалася, удзельнічала ў розных турнірах. Так, у зімовым розыгрышы першынства Гомеля па мініфутболу студэнты ГДУ заваявалі трэцяе месца. А нядаўна на заснежаным полі стадыёна «Гомсельмаш» нашы футбалісты правялі дзве сустрэчы з камандай Магілёўскага тэхналагічнага інстытута, якія прайшлі ў напружанай барацьбе. У адной з іх перамаглі гаспадары — 1:0, другі матч закончыўся з лікам 1:1.

**У. ДЖЫОЕЎ, трэнер каманды.**

## СЛУЖБА НТІ ІНФАРМУЕ

8-га красавіка (і ў кожную другую сераду наступных месяцаў) бягучага года ў 14 гадзін Гомельскі ЦНТІ (пр. Леніна, 3) праводзіць пастаянна дзеючы семінар маладых вынаходнікаў.

Запрашаюцца грамадскія інфарматары кафедр (лабараторый).

## ГЛЯДЗІЦЕ Ў КІНАТЭАТРЫ «СПАРТАК»

30 «Вялікая прагулка» — 11-10, 13-30, 16, 21-10; 31 «Русь спрадвечная» (2 серыі) — 11-10,14-10, 17; 1 «Невязучыя» — 11-30, 13-30, 16 17-40, 19-20; 2 «Хто ўвойдзе ў апошні вагон» — 11-30, 13-30, 16, 17-40, 19-20; 3—5 «Па-банку» і «Па-банку, 2», або «Удар у адказ» (два фільмы ў адзін сеанс) — 11-10, 14-30, 17-40; 30—5 «Пакаянне» — 30-га: 18-30, 31-га: 20; 1—5-га: 21.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

А354143

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 262.